# Па слядах зніклых каштоўнасцей

**Прэс-канферэнцыя "Аб захаванні культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" адбылася 24 лютага ў Нацыянальным прэс-цэнтры РБ. З журналістамі сустрэліся намеснік міністра культуры РБ Уладзімір Грыдзюшка, начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Мінісіэрсгаа культуры РБ Васіль Абламсхі, прарэкгар па навуковай працы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Марыя Бяспалая, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Людміла Кірухіна, дырэктар Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі Пётр Хацько.**



У.Грыдзюшка пачаў з паведамлення аб тым, што створана міжведамасная рабочая група па рэстытуцыі культурных каштоўнасцей. Ца гэтай справы падключаны спецыялісты Міністэрства культуры РБ, Беларускага дзяржаўнага інстыгута праблем культуры, музейныя супрацоўнікі, студэнты гістарычнага факультэта БДУ.

Вяртанне вывезеных культурных каштоўнасцей уяўляе вялікую праблему для нашай краіны. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі было знішчана каля 10 музеяў, разрабаваны больш за 200 бібліятэк. Шмат экспанатаў страціў гістарычны музей у Магілёве. V першыя дні вайны знік не толькі Крыж Еўфрасінні Полацкай, але і дзве сярэбраныя пячаткі, сярэбранае жазло караля Жыгімонта III, два ключы ад брамы Магілёва, 28 каралеўскіх і царскіх грамат, уручаных гораду. З краіны "пайшлі" 48 слуцкіх паясоў, 170 твораў жывапісу. Зараз важна, адзначыў У.Грыдзюшка, скласці каталог страчаных каштоўнасцей, вызначыць, дзе яны знаходзяцца. Пошук рабочай групы скіраваны на рэгіёны Расіі. Наладжваюцца кантакты з прыватнымі калекцыянерамі ў беларускіх дыяспарах.

Трэба аб'ектыўна ўсведамляць, што вярнуць у Беларусь гістарычныя рэчы і дакументы зараз шанцаў мала. Але магчыма, падкрэсліў Уладзімір Паўлавіч, атрымаць прынамсі іх копіі, як гэта адбылося нядаўна з лістамі Н.Орды і карцінамі В.Ваньковіча. Важна ўвесці выяўленыя каштоўнасці ў навуковы і культурны абарот.

Васіль Абламскі распавёў аб распрацоўцы Міністэрствам культуры новага Закону аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. У прыватнасці, былі ўнесены дадаткі і змены ў існуючыя нарматыўна-прававыя акты з улікам сучасных падыходаў да рэстаўрацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей. В.Абламскі паведаміў, што ў Беларусі ўводзяцца новыя нормы расцэнак на праектаванне і будаўніцтва ў мэтах стварэння таго механізму, які дазволіць як дзяржаве, так і ўласнікам актыўна праводзіць аднаўленчыя працы на помніках. Галоўнае— каб гістарычныя аб'екты набывалі сучаснае функцыянальнае значэнне.

Тое, што ў дзейнасці Універсітэта культуры і мастацтваў галоўнае месца займае вывучэнне і распаўсюджванне беларускай народнай культуры, пераканаўча давяла М.Бяспалая. Сярод нядаўна ўведзеных спецыялізацый студэнтаў БДУКіМ— этнафанаўства, тэарэтычная этнаграфія, рэжысура народных свят і абрадаў. Створаныя на базе універсітэта фальклорныя калектывы — "Валачобнікі", "Грамніцы", "Гуды" і іншыя — паспяхова выступаюць на радыё і тэлебачанні.

Пасля візіту ў БДУК Прэзідэнта РБ Аляксандра Лукашэнкі па яго ініцыятыве былі створаны тры навукова-даследчыя лабараторыі: рамёстваў, касцюма, музычных інструментаў, дзе студэнты выбраляюць рэчы паводле старадаўніх узораў. У планах універсітэта— стварэнне музея традыцыйнага беларускага рамяства.

Л.Кірухіна паведаміла, што на сёння фонд Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі налічвае каля 65 тысяч адзінак. Нягледзячы на клопаты, звязаныя з пераездам, штогод бібліятэка набывае 200-300 рэдкіх выданняў на гранты Прэзідэнта РБ. Міністэрства культуры падтрымлівае рэстаўрацыю найбольш каштоўных пісьмовых крыніц.

Задачы кансервацыі экспанатаў востра стаяць перад Нацыянальным музеем гісторыі і культуры Беларусі. 5 тысяч музейных прадметаў падлягаюць рэстаўрацыі. Пры музеі, дзякуючы падтрымцы Мінкультуры і ЮНЕСКО, створана школа прэвентыўнай кансервацыі, дзе прайшлі навучанне 15 рэстаўратараў.

—У серыі выставак "У пошуках страчанага" пад дахам Нацыянальнага музея гісторыі і культуры былі паказаны экспанаты першых музеяў Беларусі. Сёння мы пачынаем распрацоўваць яшчэ адну важную тэму: "Сучасная Беларусь і этапы культурнага будаўніцтва". Маем намер лаказаць дасягненні нашай дзяржавы за апошнія 10 гадоў, у тым ліку ў народнай творчасці, на міжнародных фестывалях і конкурсах, — абвясціў П.Хацько.

Дарэчы, завяршыліся праектныя працы, датычныя рэканструкцыі музейнага будынка, што на вуліцы імя Фрунзэ,19. Саму рэканструкцыю плануецца скончыць у 2009 годзе.

**СІ.**

***Ад рэдакцыі.*** *З ходам пошукаў вывезеных каштоўнасцей мы азнаёмім чытачоў у адным з бліжэйшых нумароў "К".*